***Шыдлоўскі С. А.***

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ПАВОДЗІНЫ ПАМЕСНАГА ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ: ДЭМАНСТРАТЫЎНАЕ СПАЖЫВАННЕ І АШЧАДНАСЦЬ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТ.)

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 16.03.2020)*

Амерыканскі эканаміст і сацыёлаг Т. Веблен у рабоце «The Theory of Leisure Class: An Economic Study of Institutions» («Тэорыя бяздзейнага класа: Эканамічнае даследаванне інстытуцый», 1899 г.) сярод стратэгій саслоўна-статуснай дыферэнцыяцыі, якія выкарыстоўвалі прадстаўнікі прывілеяванай часткі грамадства для сцвярджэння сваёй высокай грамадскай пазіцыі і падтрымання сацыяльнай дыстанцыі, называе дэманстратыўнае (прэстыжнае, статуснае) спажыванне, што можна вызначыць як празмернае, з перавышэннем асабістых патрэб, выдаткаванне матэрыяльных сродкаў на разнастайныя даброты [1, с. 121]. Падобная форма спажывання, паводле меркавання Н. Эліяса, дыктуецца логікай канкурэнтнага змагання ўнутры элітарнай групы за прэстыж. Страта апошняга нясе для асобы пагрозу выключэння з кола прывілеяваных [2, с. 88].

Звычайна дэманстратыўнае спажыванне разглядаецца як супрацьлегласць стратэгіі ашчаднасці, характэрнай для эканамічных паводзін дробнай і сярэдняй буржуазіі эпохі Новага часу, прадстаўнікі якой намагаліся ўтрымліваць свае бягучыя выдаткі ніжэй узроўню ўласнага даходу [2, с. 87]. У арыстакратычных колах ашчаднасць трактавалася як праява скупасці – маркёр паводзін «ніжэйшых класаў» або ў ёй бачылі анамальную загану ці нават псіхічнае захворванне [3, с. 264; 4, с. 134]. Паводле слоў Э. Масальскага, сама ідэя ашчаднасці яшчэ ў 30-я гады XIX ст. разглядалася ў шляхецкім асяроддзі як смелая навацыя, што ішла супраць даўняй традыцыі [5, s. 104].

Пад тэрмінам «дэманстратыўнае спажыванне» часам маецца на ўвазе дзве розныя стратэгіі: тых, хто валодае высокім статусам, і тых, хто гэтага высокага статусу дамагаецца. Паводле меркавання І. Гофмана, у грамадскіх груп, якія намагаюцца заняць больш высокае месца ў сацыяльнай іерархіі, магчымасць набываць каштоўныя матэрыяльныя сімвалы статусу апераджаюць іх здольнасць атрымліваць сімвалы, заснаваныя на «самаўдасканаленні і сацыялізацыі», што зніжае каштоўнасць матэрыяльнага [6, с. 11]. У выпадку, калі прадстаўнікі ніжэйшых сацыяльных груп спрабавалі пераймаць вобраз жыцця арыстакратаў, выдаткоўваючы на прадметы раскошы і рарытэты, яны працягвалі практыку накаплення – толькі не грошай, а дарагіх рэчаў. Як адзначаў Ж. Бадрыяр, праз валоданне рарытэтам парвеню здзяйсняў сваё жаданне зрабіцца часткай арыстакратыі, у той час як апошняя сцвярджала сваю перавагу праз адваротнае – мантацтва [7, с. 85 – 86].

Значным артыкулам выдаткаў у сем'ях прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў з'яўлялася абнаўленне гардэробу; наём слуг, арганізацыя палявання, утрыманне прэстыжнага выезду. Так, у заможных памешчыкаў існаваў звычай мяняць павозкі кожныя пяць гадоў (старыя экіпажы іранічна называліся

«ноевымі каўчэгамі»). Да статусных заняткаў адносіліся ўладкаванне аранжарэі, калекцыяніраванне [8, s. 171; 9, s. 46; 10, с. 378; 11, с. 235]. У той час для дробных землеўладальнікаў аб’ектамі статуснага спажывання маглі з’яўляцца боты, ніцяныя пальчаткі для паненак, танныя малюнкі з кірмашу [5, s. 62 – 63, 106].

Для дробных і нават сярэдніх па заможнасці землеўладальнікаў сама магчымасць рэалізацыі стратэгіі дэманстратыўнага спажывання была абумоўлена практыкай ашчаднасці. У памешчыцкіх сем’ях з сярэднім дабрабытам значная частка сродкаў адкладвалася на адукацыю дзяцей. Для кожнага шляхціца-арандатара найвышэйшай марай з’яўлялася набыццё ўласнай «фартуны», што азначала доўгія гады ці нават дзесяцігоддзі ашчаднасці.

Спосабам эканоміі і збірання грошаў на прыярытэтныя мэты выступала максімальная арыентацыя на спажыванне прадуктаў уласнай вытворчасці. Калі ў доме памешчыка гасцей частавалі пакупным хлебам, гэта шкодзіла прэстыжу гаспадыні. Паводле сведчання Я. Булгака, у маёнтках, як і сярод сялянства, прытрымліваліся «старога вясковага правіла» – набываць толькі соль і жалеза, а ўсё астатняе вырабляць саматужна [12, с. 50]. Я. Булгак згадваў, як у двары яго бацькі ў 80-я гады XIX ст. выраблялі традыцыйную мэблю, якая ўжо не адпавядала новым уяўленням аб камфорце. На многіх памешчыцкіх дварах у 2-й палове XIX ст. для ўласных патрэб працягвалі вырабляць саматканае сукно і палатно, брычкі і вазы [12, с. 50].

У падобных абставінах сам факт спажывання пакупнога прадукту з’яўляўся маркёрам сацыяльнага статусу. Так, наяўнасць імпартных спецый, цукру, солі ў складзе рацыёну харчавання, а найперш аб’ёмы іх выкарыстання дэманстравалі сур’ёзнасць сацыяльных амбіцый сямейства. Таму не толькі тлустыя, спажыўныя, але таксама вострыя і салёныя стравы на шляхецкім стале сведчылі аб статуснасці дому. Увогуле ежа, асаблівасці яе прыгатавання і спажывання сведчылі пра сацыяльны статус. Традыцыя харчавання мясцовых прывілеяваных саслоўяў адчувала моцныя знешнія ўплывы. Шэраг важных інгрэдыентаў шляхецкай кухні не вырабляўся ў краі і з’яўляўся прадметам імпарту. Папаўненне амаль абавязковай для кожнага памешчыцкага дома «аптэчкі» прадугледжвала набыццё вінаў, чаю, кавы, цукру, спецый, сухафруктаў, дэсертаў. З прускіх партоў (Гданьск, Кёнігсберг) па Бугу і Нёману на беларускія землі завозіўся цукар, «каланіяльныя тавары», віны, ром, арак, портэр, селядцы, сыры [13, s. 74]. З Рыгі «латышскія лайбы» дастаўлялі селядзец, чай, каву, лімоны, апельсіны, цукар, соль, віны [14, с. 367].

Знешняя рэпрэзентацыя высокага сацыяльнага становішча сямейства пачыналася з уязной брамы на двор сядзібы, франтон якой запаўняўся гербавымі картушамі ўладальнікаў маёнтка, а сама яна выглядала часам больш манументальна, чым дом памешчыка. Парадны эфект знешняга выгляду сядзібы мог дасягацца рознымі спосабамі. Вялікі і чысты двор у атачэнні прысадаў, паблізу фруктовы сад, невялікі, але прасторны дом з прыродных матэрыялаў, без пышных аздоб, дагледжаны, светлы і ўтульны – такі быў традыцыйны ідэал шляхецкага маёнтка. Новачасная мода прадугледжвала наяўнасць некалькіпавярховага «ўмэбляванага» дома, прасторнага двара з камяніцамі службаў, аранжарэй і зімніх садоў. Падобны ідэал «элеганцыі», апісаны

У. Сыракомлем, асуджаў многіх амбіцыйных памешчыкаў на жыццё не па сродках, калі хапала імпэту выбудаваць дом сваёй мары, але бракавала рэсурсаў на яго рамонт і падтрымку ў функцыянальным стане [15, с. 310].

Меркаванні прэстыжу вымагалі значных выдаткаў у выпадку прыёму гасцей. Іх затрымлівалі, часам сілком, да трох дзён. Звычай прадугледжваў, што, калі госць з'яўляўся ў маёнтак са сваімі коньмі, іх размяшчалі на стайні і карmілі за кошт гаспадароў маёнтка, слугі госця таксама жылі за кошт гаспадара маёнтка. Аднак з'яўляліся ўжо і выпадкі, калі памешчыкі «па нямецкім узоры» адпраўлялі коней і слуг гасцей у бліжэйшую карчму, здымаючы з сябе выдаткі на іх утрыманне, што выклікала асуджэнне [5, s. 74 – 75].

Праяўленнем гасціннасці можна лічыць існаванне інстытуту рэзідэнтаў – асоб высакароднага паходжання, якія жылі ў маёнтку на забеспячэнні гаспадара гадамі. Наяўнасць шматлікіх рэзідэнтаў-нахлебнікаў на памешчыцкім двары з эканамічнага пункту гледжання была немэтазгоднай, але ў традыцыйнай сістэме феадальных каштоўнасцей павялічвала сімвалічны капітал. Для буйных паноў шматлікая кліентура з'яўлялася рэсурсам палітычнага ўплыву. Для памешчыкаў сярэдняй рукі наяўнасць рэзідэнтаў была справай прэстыжу, а таксама крыніцай адносна кваліфікаванага персаналу. Філантрапічная дзейнасць лічылася адным з атрыбутаў панскага ладу жыцця, указвала на высокі сацыяльны статус дабрадзея [16, с. 80].

Беларускія памешчыкі значную частку сваіх даходаў выдаткоўвалі на разнастайныя святкаванні. Так, падчас масленічных куліг маглі цалкам знішчацца шматмесячныя запасы сям'і, што прымала гасцей [16, с. 92]. Паводле апісання Л. Галамбёўскага, калі ўдзельнікі гэтай забавы прыязджалі на санях на чарговы двор, гаспадар аддаваў ім ключы ад піўніцы, а гаспадыня – ад спіжарні. Кожны мог выбраць сабе пачастунак па свайму густу і столькі, колькі захоча. Так частаваліся не толькі госці, але і іх слугі, спусташаючы гадавыя запасы [17, s. 123 – 129; 18, s. 116].

Падобныя традыцыі на працягу XIX ст. усё часцей падпадалі крытыцы і разглядаліся як адзнака легкадумнага марнатраўства рэсурсаў. Так, у дыдактычным рамане «Пан Падстоліч, або Чым з'яўляемся мы і чым быць можам» Э. Масальскі падкрэсліваў, што дабрабыт у доме добрага гаспадара трымаўся не за кошт марнатраўства, а на ашчаднасці [19, s. 120]. Паводле слоў П. Бабро ўскага, колькасць і велічыня панскіх палацаў, а таксама рымска-каталіцкіх цэркваў і манастыроў на тэрыторыі Беларусі выступала сведчаннем шырока распаўсюджанай у шляхецкім саслоўі звычкі да марнатраўства, прытрымліванне якой абумовіла наяўнасць жорсткай сістэмы эксплуатацыі мясцовых прыгонных [20, с. 159].

Ацэнка П. Бабро ўскага з'яўляецца палемічнай. «Марнатраўства» у выпадку фундатарства, філантропіі або праяўлення гасціннасці не было спецыфічнай заганай выключна толькі «польскага пана». Універсальны характар дадзенай з'явы раскрываецца ў кантэксце тэорыі «эканомікі дару» (М. Мос, Л. Хайд). Паводле П. Бурдзьё, дар аб'ектыўна падразумявае ўзаемнасць і, па сутнасці, выступае запрашэннем да абмену, адтэрмінаванага ў часе. Аддорваць трэба не адразу, нечым іншым і інакш. Дзякуючы наяўнасці адтэрміноўкі

аддорвання дар пераэжываецца суб'ектыўна як акт шчодрасці. Прычым адтэрміноўка ў аддорванні можа быць настолькі значнай, што суб'ектыўна для таго, хто дарыць, яго акт з'яўляецца дармовым, як у выпадку міжпакаленных абменаў [21, с. 40 – 55].

У грамадстве існавала ўстойлівая традыцыя абмену дарункамі, які адбываўся па пэўных правілах. Паводле сведчання Л. Галамбёўскага, здаўна вядомы звычай рабіць падарункі на Новы год. Гэта было не ўзаемнае адорванне – падарункі рабілі багатыя паны сваім дваранам. Дваране маглі абдорваць свайго пана на яго імяніны, аднак часцей гэта былі не вялікія сумы, а стол ці арганізацыя свята з песнямі і танцамі [8, s. 246; 22, s. 60].

Дэманстратыўнае спажыванне часта прыводзіла да неабходнасці браць крэдыт: многія памешчыкі выкарыстоўвалі крэдытныя сродкі на «вясёлае і марнатраўнае жыццё, паездкі за мяжу» [23, с. 2]. Крэдыт бралі пры неабходнасці выплачвання пасагу сёстрам, прыняцці на сябе даўгоў родных, няўдалай камерцыі. Крэдыты ў банку пад заклад сялян браліся таксама з мэтай арганізацыі выбарчай кампаніі ў органы саслоўнага самакіравання, падчас якой арганізоўваліся банкеты і балі. Выдаткі на перадвыбарчую кампанію, паводле звестак Э. Масальскага, часам складалі да паловы даходаў з маёнтка [5, s. 62 – 63, 105]. Аднак галоўная патрэба ў крэдыце спараджалася неабходнасцю мадэрнізацыі памешчыцкай гаспадаркі. Калі запазычанасць была большай за вартасць маёнтка, аддаваліся ў рэкруты сяляне; грашовая кампенсацыя ад дзяржавы магла перавышаць рынкавы кошт прыгоннага селяніна. У выніку многія памешчыцкія гаспадаркі былі абцяжараны даўгамі, павялічваліся нядоімкі падаткаў за сялян. Пазыкі браліся пад заклад маёнткаў, даўгі памнажаліся і пераходзілі ад бацькоў да дзяцей [11, с. 234].

Прыватныя крэдытары мелі права займаць маёнтак і весці гаспадарку, пакуль не атрымлівалі за яе ўвесь памер запазычанасці. Дадзенае дзеянне называлася «tradycija» [5, s. 88]. Калі памешчык быў не здольны выплаціць запазычанасць, яго крэдытары маглі звярнуцца да працэдуры эксдывізіі – перадачы яго маёнтка ў кіраванне камісіі крэдытораў [9, s. 43].

Такім чынам, дэманстратыўнае спажыванне, якое часта пераасэнсоўвалася ў тэрмінах «марнатраўства» і «мантачанне», пры ілюзіі сваёй нерацыянальнасці з'яўлялася часткай эканамічных і палітычных стратэгій захавання дамінуючага становішча памешчыкаў-арыстакратаў у грамадстве. Прадстаўнікі колаў сярэдніх і дробных землеўладальнікаў вымушаны былі таксама прытрымлівацца статуснага спажывання, аднак рэалізацыя дадзенага стылю эканамічных паводзін абумоўлівалася ў іх выпадку патрэбай ашчаднасці або крэдыту.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Веблен, Т. Теория праздного класса / Т. Веблен. – М. : Прогресс, 1984. – 368 с.
2. Элиас, Н. Придворное общество: исследования по социологии короля и придворной аристократии / Н. Элиас ; пер. с нем. А. П. Кухтенкова [и др.]. – М. : Языки славянской культуры, 2002. – 368 с.
3. Оссовская, М. Рыцарь и буржуа: исследования по истории морали / М. Оссовская. – М. : Прогресс, 1987. – 528 с.

4. Масальскі, Э. Т. З успамінаў (1799 – 1824) / Э. Т. Масальскі ; пер. з польск. С. А. Шыдлоўскага // Маладосць. – 2014. – № 6. – С. 127 – 138.
5. Massalski, E. T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny : w 5 cz. / E. T. Massalski. – Wilno : W Druk. A. Marcinkowskiego, 1831. – Cz. 2. – 268 s.
6. Гофман, И. Символы классового статуса / И. Гофман ; пер. с англ. В. Николаева // Логос. – 2003. – № 4-5. – С. 42 – 53.
7. Бодрийяр, Ж. Общество потребления. Его мифы и структуры / Ж. Бодрийяр ; пер. с фр. Е. А. Самарской. – М. : Республика ; Культурная революция, 2006. – 269 с.
8. Gołębiowski, Ł. Domy i dwory / Ł. Gołębiowski. – Warszawa : Druk. N. Gkücksberga, 1830. – [4], 296 с.
9. Massalski, E. T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny : w 5 cz. / E. T. Massalski. – Wilno : Druk. A. Marcinkowskiego, 1833. – Cz. 3. – 197 s.
10. Корева, А. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Виленская губерния / А. Корева. – СПб. : Тип. И. Огрызко, 1861. – 804 с.
11. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней относящихся / М. О. Без-Корнилович. – 2-е изд., репринт. – Минск : Алфавит, 1995. – 355 с.
12. Булгак, Я. Край дзіцячых гадоў / Я. Булгак ; пер. з польск. мовы Т. Г. Вяршыцкай. – Мінск : Беларусь, 2004. – 415 с.
13. Lachnicki, I. E. Statystyka gubernii litewsko grodzieńskiej / I. E. Lachnicki. – Wilno : Nakład i druk J. Zawadzki, 1817. – X, [2], 88 s.
14. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 680 с.
15. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах / У. Сыракомля // Добрыя весці : паэзія, проза, крытыка / У. Сыракомля ; уклад. і камент. У. Мархеля, К. Цвіркі. – Мінск, 1993. – С. 173 – 321.
16. Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795 – 1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 168 с.
17. Gołębiowski, Ł. Gry i zabawy różnych stanów w kraju całym, lub niektórych tylko prowincyach / Ł. Gołębiowski. – Warszawa : Druk N. Glücksberga, 1831. – 332 s.
18. Gloger, Z. Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa : Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900 – 1903. – Т. 3. – 1902. – 350 s.
19. Massalski, E. T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny : w 5 cz. / E. T. Massalski. – SPb. : Druk. K. Kraja, 1833. – Cz. 4. – 286 s.
20. Бобровский, П. О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. О. Бобровский // Вестник Западной России. – Вильно. – 1865. – Т. III, кн. XII, ч. 3. – С. 157 – 172.
21. Бурдье, П. Экономическая антропология : курс лекций в Коллеж де Франс (1992 – 1993) / П. Бурдье ; пер. с фр. Д. Кралечкина. – М. : Дело ; РАНХиГС, 2019. – 416 с.
22. Gloger, Z. Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. – Warszawa : Druk P. Laskauera i S-ki, 1900 – 1903. – Т. 1. – 1900. – 316 s.
23. Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : в 3 кн. / под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилёв : Тип. губернского правления, 1882. – Кн. 1. – [6], 782, [2] с.

## РЕЗЮМЕ

В статье анализируются демонстративное потребление и бережливость как два вида экономического поведения поместного дворянства Беларуси в конце XVIII – начале XX в.

Систематизированы основные факторы, которые влияли на выбор стиля экономического поведения помещиков. Раскрыты взаимосвязи стратегий демонстративного поведения и бережливости. Выявлены особенности поведения аристократии, средних и мелких землевладельцев.

SUMMARY

The article analyzes demonstrative consumption and thrift as two types of economic behavior of the noble estate of Belarus in the late XVIII – early XX century. The main factors that influenced the choice of the style of economic behavior of landlords are Systematized. The relationship between the strategies of demonstrative behavior and thrift is revealed. Features of behavior of the aristocracy, medium and small landowners are revealed.